# Міфалагема “дзверы” ў мастацкім свеце Яна Баршчэўскага.

У мастацкім свеце Яна Баршчэўскага выразна вылучаюцца два планы: рэальны і фантастычны. Каб адчуць няўлоўную пераходную сувязь паміж імі, разгледзім вобраз дзвярэй. Дзверы ў літаральным значэнні гэтага слова, у іх ролі могуць выступаць вароты. Падарожныя, якія заблукалі пад час завірухі, бачаць агеньчык у хаце шляхціца Завальні, грукаюць: Рандар! Рандар, адчыні вароты; ахці, якая мяцеліца, саўсём паразяблі, і коні прысталі, чуць цягнуць: рандар! рандар! Адчыні вароты! (, 93).

За адчыненымі варотамі змерзлых пілігрымаў чакае цяпло. Шляхціц Завальня не толькі выратоўвае кожнага начлежніка, даючы яму прытулак, але і слухае іх казкі, міфы, пераказы, у якіх рэальнае пераплятаецца з фантастычным. Так, Янка ў апавяданні “Куцця” прачнуўся і доўга ляжаў яшчэ ў пасцелі, прыпамінаў апавяданні сляпога Францішка і арганістага: Плачка, Сын Буры, Вогненныя Духі… . Усе гэтыя гісторыі нагадвалі цуды, якія маглі толькі існаваць у напалову санлівым стане героя, але тут дзядзька адчыніў дзверы, і … сказаў:

--Уставай, Янка. Не прывыкай да ляноты; зімовыя ночы доўгія -- можна выспацца. Завальня адчыніў дзверы і ўвёў у казачны свет уяўленню пляменніка рэальныя жыццёвыя будні.

Праз дзверы наладжваецца сувязь паміж фантастычным светам і рэальным у апавяданні “Чараўнік ад прыроды і кот Варгін”.Тамаш увесь час вядзе барацьбу з д’яблам, што схаваўся пад маскаю пекнага чорнага катка і наводзіць на людзей розныя хваробы. Тамаш распазнае нячысціка і вылечвае людзей, выводзячы з іх цела вялікую колькасць жамяры, павукоў, атрутных восаў і іншага страхоцця. “Чараўнік ад прыроды” адчыняе дзверы -- і ўся куслівая жамяра знікае. Праз дзверы адбываецца пераход хваробы з адной прасторы ў другую, ад дзвярэй адскоквае кот у апавяданні “Пра чарнакніжніка і цмока…”. Каля дзвярэй у апавяданні “Белая сарока” з'яўляецца фантастычная істота - пасланец страшнай чарнакніжніцы. “Ледзь Скамароха ачнуўся ад думак, як бліскавіца асвяціла пакой і ён ўбачыў, што нейкая дзіўная страшная постаць стаіць у кутку ля дзвярэй”(, 206). Фантастычны герой блукае па свеце і выведвае, пра што думаюць людзі, пра што гавораць, што ядуць і п’юць, па рысах твару пазнае характары людзей, …заходзіць праз маленькую шчылінку, і дзверы не скрыпяць, калі ён іх адчыняе.

Дзверы ў творах Яна Баршчэўскага паўстаюць у розным стане -- “незачыненымі (“Твардоўскі і вучань”), або “прачыненымі”, (“Валасы, якія крычаць на галаве»).

Гугон - любімы вучань чарнакніжніка Твардоўскага -- аднойчы, калі настаўнік бавіў час у сваіх знаёмых, убачыў у замку ключ, увайшоў у незачыненыя дзверы, трапіў у фантастычны свет магічных чараў. Хлопчык выклікаў д’ябла, але, не ведаючы, як сябе паводзіць, быў ім

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

забіты. Д’ябал перасяліўся ў цела Гугона і пачаў жыць. Аўтар развіў фантастычную гісторыю, якая пачыналася з апісання дзвярэй з ключом у замку.

Адчыненыя дзверы ў апавяданні “Валасы, якія крычаць на галаве” паказваюць на неабачлівую даверлівасць і безразважную веру Генрыка, які павінен быў зачыніць “дзверы” сваёй душы, а не падпускаць так блізка да яе злога чалавека. Пан Генрык прагульваўся са сваёй жонкаю Амеліяй. Пад час гэтай вандроўкі героі спаткалі страшнага чарнакніжніка. Амелія адразу інтуітыўна адчула і ўбачыла зло, якое зыходзіць ад гэтага чалавека, а яе муж паверыў у міфічную гісторыю злоснага старца.Чарнакніжнік распавядаў як ён імкнуўся ўвесь час рабіць людзям дабро, за што і пакутаваў, мусіў ратавацца ўцёкамі. “ Са мною прычыніўся жудасны выпадак: выходзячы, я пакінуў незамкнёныя дзверы, а на стале ў паперках ляжалі белыя парашкі, патрэбныя мне ў маёй навуцы. Жонка пана зайшла ў мой пакойчык, думаючы, што гэта лекі. Пакутуючы ад болю галавы, яна загадала падаць шклянку вады, усыпала туды парашок, выпіла і ўмомант памерла. Я не быў вінаваты, але, ратуючыся ад суда, мусіў адтуль уцякаць і шукаць прытулку ў іншым месцы”(1, 225). Генрык упадабаў старога чалавека, выконваў усе яго парады, што і згубіла Амелію. Ён паверыў у гісторыю пра жончыны валасы, якія крычаць і прывабліваюць пагляды хлопцаў. Герой успамінае: “ Я быў здзіўлены і непакойны. Вырашыў не спаць усю ноч, абы толькі даведацца праўды. Увечары, калі Амелія, запаліўшы свечку, пайшла ў асобны маленькі пакойчык памаліцца, я падкраўся на пальчыках да прачыненых дзвярэй, прыслухаўся і пачуў піск, такі тонкі, нібы камар, гудучы, лётае ля скроні і шукае, дзе б тнуць” (1, 232). Прачыненыя дзверы, магчыма, стварылі гэты падманны эфект, Генрык паверыў старцу і загубіў сваю жонку. Пасля смерці Амеліі герой адумаўся, ён ухапіў пісталет, пабег да старца з намерам забіць яго. “Ледзь адчыніў дзверы— з пустое хаты вылецела велізарная чарада кажаноў і са страшным піскам пачала кружляць над гэтаю хацінаю…”( 1, 234). Герой адчыніў сабе дзверы да праўды, расплюшчыў вочы і вырашыў адпомсціць ворагу.

На дзвярах засяроджваецца ўвага герояў у апавяданні “Стогадовы стары і чорны госць”. Апавядальнік успамінае як у восеньскі вечар уся сям’я бачыла дзіва: дзверы не адчыняліся, а Гараська стаіць пасярод хаты… “Уся постаць лёгкая і, здаецца, вышэйшая чым зазвычай. З кожнаю хвілінаю робіцца ўвачавідкі лягчэйшы і танчэйшы і растае ў паветры” (1,257). Гэта душа Гараські адведвала суседзяў і знаёмых, таму што ён думаў пра іх.Дзед ведаў калі памрэ і рыхтаваўся да гэтага пераходнага моманта, а яго з’яўленне праз зачыненыя дзверы сімвалізуе новы этап жыцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Праз дзверы ў новым, нікому не вядомым абліччы: “твар цёмны, пануры, зусім бяскроўны, аніякага пачуцця на ім, нос тонкі, пакрыты сухою скураю, вусны без колеру…”(1, 319) прыйшоў урач Саматніцкі (“Душа не ў сваім целе”).

З дзвярыма ў Яна Баршчэўскага бывае звязаным рэзкі абрыў аповяду, паварот у сюжэце, а іншы раз праз іх уводзіцца новы герой, напрыклад, “нечакана адчыняюцца дзверы – заходзіць увесь абсыпаны снегам арганісты з Расонаў”(1, 181).

Падобная сітуацыя назіраецца і ў апавяданні “Вужыная карона”: “нехта загрукаў у браму, і сабакі забрахалі. Выбег парабак і, вярнуўшыся, паведамляе: прыехаў пан Марагоўскі. Пан Завальня саскочыў з ложка, пачаў хуценька апранацца, каб павітаць госця”(1, 181) . Грукат ў браму выступае як передумова новага апавядання. Пан Марагоўскі папрасіў прабачэння за тое, што парушыў прыемную размову і пахваліў фурмана Якуша, які зайшоў разам з ім і можа расказаць шмат цікавых гісторый і выправіць сітуацыю. Аўтар не толькі звяртае ўвагу на тых, хто ўваходзіць праз дзверы, але і падкрэслівае ролю асоб, якія знаходзяцца каля дзвярэй. У аповесці “Душа не ў сваім целе” перад Саматніцкім расчыняе дзверы нямы лёкай. Ён захоўвае таямніцу рытуалаў.

Дзверы ў творах Яна Баршчэўскага паказваюць на закрытую прастору, за ёй невядомае. Пры адчыненых дзвярах – пустэча.

- “Дом без дзвярэй і вакон, ніхто тут не жыве, - сказаў хлопчык сляпому ў апавяданні «Плачка” - Дарэмна толькі звярнулі з дарогі.
- Але тут пасярод хаты з'явілася кабета ў жалобнай вопратцы са смутным тварам” (1, 169). Плачка звярнулася да зачыненых душаў людзей, клапацілася, каб яны шанавалі мінуўшчыну, разумелі таямніцы склепаў і каплічак. Гераіня Баршчэўскага бачыць як сяляне знайшлі мураваны склеп, раскапалі і вакол, каб адкрыць з усіх бакоў засыпаныя зямлёю сцены. Людзі працавалі не адзін дзень. Адпачынак іх быў кароткі… Нарэшце, знайшлі жалезныя дзверы. З абодвух бакоў гэтага склепа былі маленькія вакенцы, на якіх яшчэ моцна трымаліся праржавелыя краты.

Выламалі дзверы і адчынілі гэты склеп, куды стагоддзяў колькі не заглядваў сонечны прамень,- глуха там бы ў магіле. Заходзяць з агнём. Усіх апанаваў страх: паўсюль – пасярод і ля сцен – у розных паставах ляжаць шкілеты; косці рук і ног яшчэ ў цяжкіх кайданах.” (1, 169). Сваімі дзеяннямі людзі парушылі спакой загінуўшых арыштантаў. Аўтар заўважыў, што героі ўвайшлі не з шаноўным памінаннем, а вераломна выламалі дзверы. Магчыма, Плачка баіцца, што будзе ўчынены здзек над святыняй, таму і сядзіць перад дзвярыма касцёла святога Ксаверыя як вартаўнік. Гераіня Баршчэўскага ахоўвае і склеп у апавяданні “Таварыш у падарожжы”. Дзіўныя гісторыі, узноўленыя ў апавяданнях “Плачка” і “Таварыш у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

падарожжы”, блізкія па зместу. Пан Дамінік з апавядання “Таварыш у падарожжы”, як і пан М. з апавядання “Плачка”, хацеў знайсці скарбы. Ён не думаў пра ўшаноўванне мінуўшчыны, а толькі клапаціўся пра ўласнае ўзбагачэнне. Пан Дамінік паслаў свайго чалавека ў падземныя сховы. “Той мусіў выконваць панскі загад. Калі апынуўся на самым дне ямы з ліхтаром у руках, убачыў адчыненыя дзверы, скляпенне на слупах, усюды магільная цішыня; са страхам мінае ён пусткі і ўрэшце заходзіць у велізарны пакой. Тут, асветленая агнём ліхтара, зіхацела на сценах срэбным і залатым бляскам зброя і розныя аздобы. На крэсле, узлокціўшыся, спала кабета…”(1, 249). Калі яна прачнулася, моцна абурылася, думаючы, што да яе прыйшоў яшчэ адзін шукальнік лёгкіх скарбаў. Плачка нават разбудзіла лютых звяроў, але, даведаўшыся, што чалавек прыйшоў не па сваёй ахвоце,- сказала засмучаным галасам: “Дарую табе, ідзі і скажы жорсткім людзям: “не дадуць Вам шчасця скарбы, калі міласэрнасць не змякчыць вашае сэрца, гэтыя дарункі ўзбагачаюць толькі тых, хто ў іншым чалавеку бачыць бліжняга свайго і брата”(1 , 249). У дадзеным мастацкім фрагменце адчыненыя дзверы даюць магчымасць гераіні непасрэдна звярнуцца да народа.

Такім чынам, у творах Баршчэўскага выкарыстоўваецца сінанімічны рад: дзверы, вароты, брама. Назва брама падаецца ў найбольш сакральных сітуацыях. У апавяданні “Бура” асветленая свечкамі брама падкрэслівае духоўнасць і дабрыню шляхціца Завальні, які клапоціцца пра падарожных. Магчыма, падобны клопат праяўляе пра сваіх братоў езуіт-брамнік з апавядання «Шкаляр-Коцэфуга”.

Вобраз дзвярэй у мастацкім свеце з'яўляецца пераходным вобразам паміж фантастыкай і рэальнасцю. Аўтар па-майстэрску ўводзіць гэты вобраз у мастацкую тканіну, так, што паступова мяжа паміж адрознымі планамі сціраецца.

Літаратура:

1. Баршчэўскі Я.Выбраныя творы / Уклад., прад., камент.М. Хаустовіча – Мн.: “Беларускі кнігазбор”, 1998.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ